БУДАЎНІКОЎ — БОЛЬШ, КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ — МЕНШ

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, старшыня рабочай групы па праблемных пытаннях у будаўнічай галіне Андрэй Кабякоў даручыў да 1 кастрычніка 2013 года ўрэгуляваць у краіне суадносіны колькасці будаўнікоў і прадстаўнікоў адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату. Адпаведнае заданне ён даў на чарговым пасяджэнні гэтай рабочай групы, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле інфармацыі начальніка аддзела Камітэта дзяржаўнай бяспекі Аляксандра Сівачэнкі, на будаўнічых пляцоўках горада Мінска на канец 2012 года працавалі каля 10 тыс. чалавек рабочых спецыяльнасцей, а колькасць апаратных работнікаў і вытворчага персаналу складала крыху больш за 7 тыс. Гэта значыць на трох працуючых непасрэдна на будаўнічай пляцоўцы прыпадае каля двух чалавек адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату, паведаміў ён.

«Такім чынам, ёсць арганізацыі, у якіх на рабочых прыпадае вельмі шмат астатніх работнікаў. Так быць не павінна, з гэтым неабходна заканчваць», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта даручыў членам рабочай групы да 25 ліпеня бягучага года вызначыць колькасць персаналу асноўных айчынных будтрэстаў, правесці іх аналіз і пры неабходнасці давесці паказчыкі суадносін колькасці рабочых і работнікаў адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату да ўстаноўленых норм. «Да 1 кастрычніка бягучага года гэтыя суадносіны павінны быць поўнасцю прыведзены ў адпаведнасць з існуючымі нарматывамі», — заявіў старшыня рабочай групы.

Намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Дзмітрый Семянкевіч у сваю чаргу паведаміў, што ведамства ўжо зацвердзіла адпаведны загад.

Андрэй Кабякоў таксама даручыў прадумаць і мадэрнізаваць крытэрыі, якія ўплываюць на суадносіны колькасці асноўных рабочых і работнікаў адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату.

МІЖПАРЛАМЕНЦКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА СТАНЕ БОЛЬШ ЦЕСНЫМ

Гэтымі днямі ў Беларусі знаходзіцца парламенцкая дэлегацыя Арменіі пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Нацыянальнага сходу Эдуарда ШАРМАЗАНАВА. Падчас візіту ўжо адбылася сустрэча армянскай дэлегацыі са старшынёй Палаты прадстаўнікоў беларускага парламента Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ. Акрамя Мінска, армянскія парламентарыі плануюць наведаць Брэсцкую вобласць.

Падчас сустрэчы з кіраўніком ніжняй палаты беларускага парламента абмяркоўваліся, у першую чаргу, шляхі развіцця міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Уладзімір Андрэйчанка выказаў падзяку армянскаму боку за падтрымку, якую парламентарыі гэтай краіны аказалі нашай дэлегацыі на нядаўна завершанай 22-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Стамбуле. Бакі дамовіліся працягваць працу ў фармаце ўзгаднення пазіцый па асобных пытаннях і ў іншых міжнародных парламенцкіх арганізацыях: Міжпарламенцкай асамблеі СНД, парламенцкай асамблеі АДКБ. Акрамя гэтага, спікер Нацыянальнага сходу Беларусі пацвердзіў запрашэнне прыехаць у Беларусь для Овіка Абраамяна, старшыні Нацыянальнага сходу Арменіі.

Падчас сустрэчы гаварылі і пра супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы. На думку абодвух бакоў, яно пакуль што знаходзіцца на недастатковым узроўні. Пры гэтым Беларусь і Арменія валодаюць вялікім патэнцыялам для далейшага эканамічнага ўзаемадзеяння. Уладзімір Андрэйчанка заявіў, што Беларусь зацікаўлена рэалізоўваць самыя розныя праекты на армянскай зямлі, у тым ліку — у кірунку вытворчай кааперацыі. Парламентарыі абедзвюх краін дамовіліся вызначыць паўнамоцных ад беларускага і армянскага боку для працы ў Міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве.

Дэлегацыя Рэспублікі Арменія будзе знаходзіцца з візітам у Беларусі да 14 ліпеня. Сярод запланаваных мерапрыемстваў значыцца таксама сустрэча са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Канстанцінам Сумарам.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

■ Учора

«ПАДПІСАЎСЯ НА «ЗВЯЗДУ»... І ВЫЙГРАЎ!

Так — хочацца верыць — лічаць усе пастаянныя чытачы старэйшай беларускай газеты, бо маюць магчымасць пяць разоў на тыдзень атрымліваць свежую і цікавую інфармацыю, прычым — на роднай мове...

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Аднак асобныя з іх могуць пахваліцца і зусім канкрэтнымі рэчамі, якія выйгралі ў звяздоўскай гульні: некаму і некалі пашчасціла на тэлевізар ці дзесяць трубак шпалераў, на парачку парсючкоў альбо свяцільнік, на халадзільнік «Атлант»...

Учора намаганнямі аўтарытэтнай камісіі ў складзе пастаянных чытачоў «Звязды» і ўдзельнікаў гульні Ніны Іванаўны Астроўскай, Веры Антонаўны Урбан і інжынера ўпраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Крысціны Уладзіміраўны Казялецкай (на здымку) спіс гэтых шчасліўчыкаў папоўніўся. Віншуем! А тым, хто таксама хацеў бы штосьці выйграць, параім: выпісвайце газету, дасылайце карткі на розыгрыш.

Афіцыйна:

12 ліпеня 2013 года адбыўся розыгрыш прызавога фонду рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду», арганізатарам якой з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 25 сакавіка 2013 года (пасведчанне № 2139) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 30 красавіка па 30 верасня 2013 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» трэцяга квартала або другога паўгоддзя 2013 года.

Удзел у гульні прынялі 559 падпісчыкаў газеты «Звязда». Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Прызы сярод удзельнікаў гульні размеркаваліся наступным чынам:

суперпрыз — халадзільнік «АТЛАНТ МХМ-2808-90 261770000007» (краіна вытворчасці — РБ) 130286-030-ПА0229720, 44RB/20 выйграла: Нічыпаровіч Галіна Міхайлаўна, в. Магільна Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Лічбавыя цюнары BBK STB 115, (Расія) выйгралі:
Лаўрэнаў Уладзімір Міхайлавіч, в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна;
Харэвіч Марыя Францаўна, в. Стрынадкі Глыбоцкага раёна;
Заяц Анастасія Арцёмаўна, в. Прыстарань Светлагорскага раёна;
Юргілевіч Тамара Іванаўна, г. Дзятлава Гродзенскай вобласці;
Судараў Леанід Пятровіч, в. Смятанічы Шклоўскага раёна;
Савельева Галіна Мікалаеўна, г. Вілейка Мінскай вобласці;
Сівы Віктар Фёдаравіч, г. Валожын Мінскай вобласці;
Старосценка Нэлла Іванаўна, г. Мінск;
Скрыган Жанна Леанідаўна, а.г. Грозава Капыльскага раёна;
Казлова Ганна Апанасаўна, г. Калінкавічы.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні: (017) 287 19 68.

МІЛЬЁНЫ ДОЗ — ДА ВЫНІШЧЭННЯ

У чэрвені супрацоўнікі міліцыі выявілі звыш 1 тыс. фактаў незаконных пасеваў маку і канопляў, вынішчылі звыш 44 т нарказелля. Аператыўнікі Рэчыцкага РАУС на тэрыторыі плошчай 1,1 га выявілі 3 т дзікіх канопляў (1,5 млн доз). А ў Любанскім раёне на плошчы 3 га было вынішчана 5 т канопляў (каля 2,5 млн доз).

Як паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, на працягу лета ў краіне рэалізуецца праграма «Мак». Да адміністрацыйнай адказнасці за рэалізацыю насення маку прыцягнута 14 чалавек, канфіскавана звыш 2,2 т насення маку, што адпавядае 17 тыс. доз. Усяго па лініі незаконнага абарачэння наркотыкаў за месяц выяўлена 369 злачынстваў, да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 262 чалавекі, канфіскавана звыш 750 кг макавай саломы і марыхуаны. Заведзена крымінальная справа ў дачыненні да раней судзімага непрацуючага жыхара Хоцімска, у якога канфіскавана каля 1 кг высушанай марыхуаны.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Зенит-БелОМО»
(продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

изолированного помещения многофункционального назначения, инвентарный номер 631/D-10341, об. пл. 1351,1 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Чапаева, д. 26-2.

Начальная цена с НДС – 1 849 968 000 бел. руб.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Аукцион состоится **13.08.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.08.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки»
(организатор аукциона)
по поручению Червенского райпо
(продавец)
проводит открытый аукцион по продаже

здания магазина № 63, инвентарный номер 615/С-15650, об. пл. 538,5 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, д. 1.

Начальная цена с НДС – 1 350 144 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,1296 га. (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Аукцион состоится **19.08.2013** в 12.30 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.08.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки»
(организатор аукциона)
по поручению ЧУП «Молодечненский пищевой комбинат»
(продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже
объектов недвижимого имущества,
расположенных по адресу: Минская область,
г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 153, в составе:

административное здание, инвентарный № 630/С-1936, об. пл. 366,4 кв.м; административное здание, инвентарный № 630/С-6352, об. пл. 345,8 кв.м; здание пилорамы, инвентарный № 630/С-1935, об. пл. 350,6 кв.м; арматурный цех, инвентарный № 630/С-16781, об. пл. 635,5 кв.м; здание столярного цеха, инвентарный № 630/С-16783, об. пл. 442,5 кв.м; здание гаража, инвентарный № 630/С-16786, об. пл. 816,7 кв.м; здание склада, инвентарный № 630/С-4730, об. пл. 401,8 кв.м.

Начальная цена с НДС – 3 967 744 573 бел. руб.

Площадь земельного участка – 2,0142 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования; ограничение: 0,0166 га – охранная зона подземных кабельных линий электропередачи). Обременения – частичная аренда.

Задаток в сумме 140 000 000 (сто сорок миллионов) бел. руб. перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 05.06.2013 г.

Аукцион состоится **23.07.2013** в 14.00 по адресу: г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, 62, зал заседаний.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.07.2013** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»
доводит до сведения заинтересованных лиц
О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
о строительстве жилых помещений объекта
«Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом),
опубликованную в газете «Звязда»
от 10 мая 2013 года № 85 (27450):

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 63, № 64, № 65, № 66, № 67, № 68, № 73, № 76, № 78, № 86, № 88, № 96, № 98, № 106, № 108, № 116, № 118, № 126, № 128, № 186, № 188, № 196, № 198, № 206, № 208 без учета выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 12 844 441 руб.

Предложения согласно настоящих изменений в проектную декларацию действуют до 15 августа 2013 года.

УНП 100071325

■ З нагоды

У НАС — СВОЙ ВЕЛАСІПЕД!

Пазаўчора паведамлялася, што Камітэт Дзяржкантролю правёў праверкі і зноў выкрыў шмат парушэнняў у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. І па фарміраванні цэн, і па эканоміі і беражлівасці, ды і па многіх іншых напрамках.

Ранкам, выходзячы з дому, сустракаю знаёмага сантэхніка. Пытаю:

— Як жыццё? Учора вашаму ведамству наганяй давалі. Можа, працуеш по-новаму?.

— Адчапіся, — ён нічога і не чуў пра тыя грозныя праверкі. — Мне што? — выклікаў мора, паломак — процьма, а вечарам буду пры грашах.

І, не спяшаючыся, пашыбаваў сваёй дарогай.

Дарэчы і недарэчы мы, калі што, любім ківаць на замежжа. І на іх вопыт.

Дазвольце і мне «кіўнуць». Ківок будзе якраз пра ЖКГ. Іхнюю ЖКГ, вядома.

Пад самы канец існавання СССР давялося працяглы час пажыць за мяжой. Жыў у доме звычайных людзей. Шмат убачыў цікавага. І аўтаматычную пральную машыну, і пасудамыйны хатні агрэгат — у нас пра такую тэхніку тады яшчэ і не чулі.

Сядзім аднойчы з гаспадаром у садку ля дома, п'ём каву, на блізкія Альпы любуемся. І тут зазваніў тэлефон.

— Так-так, — адказвае некаму гаспадар. — Прыязджайце, раз хочаце.

Неўзабаве ля дома спынілася грузавая «Таёта». З яе выйшаў мужчына ў акуратным спецадзенні і з сумкай на плячы. Павітаўся з намі і пайшоў у хату. А мы працягвалі бавіць час за кавай.

Недзе праз паўгадзіны незнаёмец выйшаў, сказаўшы, што ўсё ў парадку, паціснуў нам рукі і з'ехаў.

— Хто гэта быў? — пытаюся. — Мо радня якая? Бо цікава, каго гэта аднаго пусцілі ў шыкоўны катэдж на паўгадзіны, не кантралявалі яго там. І што ён рабіў — таксама ўцяміць не магу.

— Электрык гэта, — адказвае гаспадар.

— Няўжо аварыя якая?

—Ды не, планавы абход. Прафілактыка. Прыйшоў паглядзець, мо дзе якая праблема. Каб папярэдзіць.

Не ўтойваю здзіўлення. І гаспадар цярпліва тлумачыць, што ў іх сістэма абслугоўвання працуе менавіта так. Ён выбраў фірму, заключыў дагавор. За домам замацавалі адпаведнага спецыяліста. Заробак яго вельмі залежыць ад колькасці аварыйных выклікаў. Чым іх менш, тым плацяць больш. Калі выклікаў нуль, тады ў майстра ёсць магчымасць атрымаць самыя вялікія грошы. Вось яны і не спяць, чакаючы паломак, а носяцца па хатах з прафілактычнымі аглядамі — каб прадухіліць бяду задоўга да яе з'яўлення.

— А ў вас што, не так? — пытае гаспадар, бачачы маё страшэннае здзіўленне.

—Не, — прызнаюся. — У нас наадварот, чым больш паломак, тым лепш яны зарабляюць.

Гаспадар працаваў галоўным інжынерам на заводзе, меў добры матэматычны склад мыслення. Здзіўлена паглядзеў на мяне, а потым жахнуўся.

— Дык вы ж прападзяце. Вашы майстры зацікаўлены, каб было як мага больш паломак. А то і самі ламаць пачнуць, каб зарабляць больш.

І што тут будзеш пярэчыць?

Хоць і ў іх сістэме я ўбачыў хібы, якія могуць здарыцца пры яе прымяненні нашымі людзьмі.

— Слухай, — кажу яму. — А не было выпадку, каб майстар папрасіў цябе тэлефанаваць яму, а не ў дыспетчарскую, калі што здарыцца? Ён гатовы ў любы момант хуценька прымчацца. Толькі каб выклік не быў зафіксаваны і на заробак не паўплываў.

Гаспадар здзіўляецца. Шчыра не разумее, што я яму кажу.

— Як гэта ён такое папросіць? Ведае ж — я, калі што, павінен дыспетчара інфармаваць.

Праз колькі дзён да яго ў дом прыехаў водаправодчык з прафілактычным аглядам, за ім спецыяліст па газавай апаратуры. Працавалі акуратна, грошай не бралі і пляшку ім ніхто не ставіў.

Аднаму майстру, калі той скончыў працу, я ціхенька кажу.

— А не было ў вас думкі дамовіцца з гэтым гаспадаром і іншымі наўпрост. Маўляў, тэлефануй мне, калі што. Я табе хутка і бясплатна ўсё адрамантую, толькі каб не было адзнакі ў дыспетчара. Вам жа так выгадней?

— Як такое прапанаваць? — не зразумеў і водаправодчык. — Ён жа павінен у дыспетчарскую тэлефанаваць, калі што. Як жа інакш?

Не прайшло там маё «ноў-хау», якое ў нас магло прайсці з лёгкасцю.

Больш за дваццаць гадоў мінула з таго часу. Назіраю, як працягваюць у нас вынаходзіць свой айчынны веласіпед для мадэрнізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А камунальшчыкі галосяць, што тарыфы не пакрываюць іх выдаткі, і дзяржава шчодра даплачвае да лічбаў, якія тыя называюць.

Я не спецыяліст у стратэгіі ЖКГ. Але ж бачу, што робіцца ў нас пад носам. Сябар расказвае, што іх прадпрыемства збіраецца закупляць адпаведнае абсталяванне і самім вырабляць энергію для сваіх патрэб — намнога танней абыдзецца. Сёння пабачыў: вуліцу Карла Маркса ля Дома афіцэраў зноў раскапалі ўшчэнт, мяняюць трубы. Але ж такія работы там вяліся некалькі гадоў таму — некалькі месяцаў шчыравалі. Ці трубы не той сістэмы тады выбралі, ці паклалі не так? Хто адкажа? Ля пад'езда нашага дома павесілі аб'яву, што на два тыдні адключаюць гарачую ваду. Гэтая завядзёнка цягнецца з году ў год — маўляў, так трэба для праверкі сістэмы. У канцы ацяпляльнага сезона батарэі ў кватэрах, нягледзячы на вясну за акном і дарагоўлю энергарэсурсаў, аж трашчалі ад гарачыні — таксама, маўляў, для праверкі. Даволі дзіўна для нашага часу. Цяпер нават звышскладанейшую ядзерную зброю цывілізаваныя краіны навучыліся выпрабоўваць без рэальных выбухаў, а толькі мадэлюючы на камп'ютарах. Мы ж са звычайнымі трубамі і цеплатрасамі не можам разабрацца па-гаспадарску. А толькі так разбіраемся, каб звычайны жыхар памучыўся.

Дарэчы, гісторыю пра тое, як вядуць прафілактычныя работы іх калегі з Захаду, я расказаў айчынным сантэхнікам. Яны пасмяяліся, а потым пасур'ёзнелі і папрасілі, каб наверсе нідзе пра гэта не расказваў. Бо ім каму хутка на пенсію, а каму проста менталітэт не дазваляе прывычную «лагістыку» перайначваць.

Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ

■

■ Якасць жыцця

НЕ БУДЗЕМ БЮРАКРАТАМІ НА РОЎНЫМ МЕСЦЫ

Мая маладая калега яшчэ ў мінулым снежні ўчыніла правапарушэнне: перабегла насупраць свайго пад'езда вуліцу ў забароненым месцы, праз суцэльную лінію. Пастаяла з цяжкімі пакункамі: да святлафора — далёка, машын на вуліцы няма, міліцыі не відаць — ну і рызыкнула...

І літаральна ля прыступак свайго пад'езда трапіла ў рукі дружыннікаў ДАІ. А тут і з ДАІшнага аўтамабіля, які стаяў за рагом, прыйшоў аўтаінспектар... Вядома, каб навідавоку было гэтае аўто — ніколі б яна не зрабіла парушэння. Але віну сваю калега прызнала, а раз грошай пры сабе не было — атрымала квітанцыю на штраф — 100 тысяч — і пайшла дадому. Літаральна на другую раніцу збегала ў банк, заплаціла свой штраф, захавала квітанцыю і, натуральна, з тых часоў стала самым дысцыплінаваным пешаходам.

Мінула больш за паўгода — і атрымлівае калега запрашэнне ў бухгалтэрыю, дзе ёй паказваюць паперу з суда, паводле якой ёй належыць тэрмінова заплаціць штраф. У адваротным выпадку, натуральна, штраф будзе спаганяцца праз бухгалтэрыю вылічэннем з заробку. Зразумелая разгубленасць чалавека, які разлічыўся за сваё правапарушэнне (не за злачынства!) і зноў зрабіўся вінаватым. Аказалася, што квітанцыю пра аплату трэба было альбо праз пошту, альбо асабіста даставіць у ДАІ... У нашым выпадку добра, што квітанцыя захавалася, і другі раз плаціць не давялося.

Але пытанне застаецца. Зразумела, «штрафнікоў» у ДАІ куды менш, чым тых, хто аплачвае праз банкі і інтэрнэт крэдыты, камунальныя паслугі, тэлефон, робіць закупы.... І ніхто ніколі не атрымаў паперу з патрабаваннем з'явіцца ў ЖЭС альбо ў банк ці краму, каб даказаць, што ён разлічыўся. А тут навошта? На банкаўскім чэку аб аплаце за штраф абавязкова запісваецца і адрас, і прозвішча. Калі гэтага мала — дык трэба ўвесці норму ўпісваць яшчэ і асабісты нумар, паводле якога ДАІ яшчэ прасцей здолее праверыць, ці заплачаны штраф. А калі ў праваахоўнікаў ёсць сумненне, што аштрафаваны чалавек паведаміў пра сябе чужыя звесткі, — дык і гэта не праблема для таго ж інспектара ДАІ, які можа звязацца з адпаведнымі пашпартнымі службамі і, як той казаў, «прабіць» гэтыя звесткі і на месцы ўпэўніцца, што чалавек — сапраўды той, кім назваўся.

А калі б штраф выпісалі чалавеку з-за мяжы? Альбо з далёкай беларускай вёсачкі, дзе ні інтэрнэту, ні банка, ні пошты няма? Чалавек заплаціў бы штраф у любой адпаведнай установе, і хай сабе едзе з чыстым сумленнем дадому, не пачынаючы потым перапіскі дзеля доказаў таго, што ён абавязак выканаў.

Вядома, па вялікім рахунку, не так ужо і цяжка ўкласці ў канверт квітанцыю аб аплаце штрафу альбо нават асабіста прывезці ў міліцыю ці ДАІ. Але думаецца, што існуючае правіла — гэта рудымент і атавізм у наш час інфарматызацыі. І калі зараз на парадку дня стаіць пытанне дэбюракратызацыі — дык давайце не будзем бюракратамі на роўным месцы.

Пятро РАМАНЧУК

■

■ Падрабязнасці

УСЕ ПАЦЯРПЕЛЫЯ Ў ДТЗ ВА УКРАІНЕ БЕЛАРУСЫ ЗМЕШЧАНЫ Ў БАЛЬНІЦЫ БРЭСТА

Імёны пацярпелых размешчаны на афіцыйным сайце Валынскай абласной адміністрацыі, паведамляе БЕЛТА.

Гэта мінчане Настасся Ібрагімава (1998 года нараджэння), Таццяна Дарожка (1999 г.н.), Мікалай Міхееў (1970 г.н.), Алег Саўчанка (2004 г.н.), Аляксей Зянькоў (1999 г.н.), Мацвей Зянькоў (2004 г.н.), Мікалай Зянькоў (1997 г.н.), Максім Зянькоў (1997 г.н.), Паліна Кацуба (1997 г.н.), Вера Бобіч (1999 г.н.), Іван Бобіч (1975 г.н.), Марыя Бобіч (2007 г.н.), Людміла Няхайчык (1955 г.н.), Павел Шаўчэнка (1997 г.н.), Вольга Аляксандрава (1980 г.н.), Наталля Бондарава (1999 г.н.), Аляксандра Несцяронак (2001 г.н.), Ульяна Аляксандрава (2007 г.н.), Мікіта Няхайчык (2003 г.н.), Мацвей Няхайчык (2005 г.н.), Ілья Трускоўскі (1999 г.н.), Таццяна Мяжэнная (1973 г.н.), Аляксандр Мяжэнны (1973 г.н.), Ірына Кавалёва (1986 г.н.), Аляксандра Пракоф'ева (1999 г.н.), Ганна Скарадуля (1998 г.н.), Максім Калечанка (1983 г.н.).

Паводле звестак МНС Беларусі, усе пацярпелыя ў аварыі беларусы, а таксама тыя, хто не атрымаў траўмаў, ужо выехалі ў дастаўлены ў Брэст.

У Брэсце іх усіх агледзяць урачы. Тыя, каму медыцынская дапамога не спатрэбіцца, будуць адпраўлены ў Мінск. Нагадаем, што 11 ліпеня каля 7.30 на 93-м кіламетры аўтадарогі Даманавае-Ковель каля вёскі Воля-Любітоўская Ковельского раёна Валынскай вобласці Украіны сутыкнуліся турыстычны аўтобус, які перавозіў групу беларускіх грамадзян у Балгарыю на курорт «Чарнаморац» (50 пасажыраў і 2 вадзіцелі), і рэйсавы аўтобус, які рухаўся з Луцка ў Шацк. Упраўленне ДАІ МУС Украіны паведамляе аб прыкладна 30 пацярпелых і 8 загінуўшых. Вядома, што ў аварыі загінуў грамадзянін Беларусі — мінчанін Пётр Грыбанаў 2000 года нараджэння. Па факце ДТЗ заведзена крымінальная справа па ч. 3 арт. 286 Крымінальнага кодэкса Украіны (парушэнне правіл бяспекі дарожнага руху або эксплуатацыі транспарту асобамі, якія кіруюць транспартнымі сродкамі, што прывяло да гібелі некалькіх асоб). Праводзіцца расследаванне.

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі арганізавала тэлефон гарачай лініі для інфармавання і аказання псіхалагічнай дапамогі родным і блізкім пацярпелых у ДТЗ у Валынскай вобласці. Нумары тэлефонаў: +375-17-209-27-76, +375-17-209-27-67.